# КАНФЕСІЙНЫЯ ЛІДАРЫ БРАСЛАЎСКАГА ПАВЕТА ВІЛЕНСКАГА ВАЯВОДСТВА ВА ЎСПАМІНАХ СТАРАСТЫ ЗЕЛІСЛАВА ЯНУШКЕВІЧА (1923–1932 гг.)

**Базарэвіч Ганна ХасенІеўна**
аспірант кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава; магістр гістарычных навук (г. Віцебск, Беларусь)

Пасля заключэння Рыжскай мірнай дамовы з 1921 г. Браслаўскі павет адміністрацыйна прадстаўляў усходні абшар Віленскага ваяводства. Рэгіён спрадвеку шматнацыянальны і шматканфесійны. Прадстаўнікі ўсіх веравызнанняў мелі сваіх духоўных лідараў, якія мусілі рэгуляваць пытанні ў стасунках з уладай, што датычыліся рэлігійных спраў, а ў некаторых выпадках і грамадска-палітычных.

Зеліслаў Янушкевіч, які займаў пасаду старасты ў Браслаўскім павеце з 1923 па 1932 гг. пакінуў пасля сябе мемуары, прысвечаныя ўспамінам аб



нный архив библиотеки МГУ имени А.А. Ку

дзяржаўнай службе ў Браславе [1]. Значная частка якіх была прысвечана стасункам з духавенствам. Безумоўна, успаміны носяць суб'ектыўны характар, аднак, яны не пазбаўленыя гістарызму і носяць характар гістарычнага сведчання. Праз апісанне духоўных асоб З. Янушкеіч перадае канкрэтныя эпізоды і падзеі, характарызуе формы ўзаемадзеяння канфесійных лідараў з мясцовым прадстаўніцтвам улады, сведчыць аб праблемах, якія існавалі ў рэлігійных супольнасцях рэгіёна. Часта факты, якія прыводзіў аўтар мелі адлюстраванне ў прэсе і іншых крыніцах, што пацвярджае праўдзівасць сведчання.

У 1920–1930 гг. большая частка вернікаў у павеце прадстаўляла каталіцтва. 9 заходніх гмінаў павета належалі да Ковенскай дыяцэзіі. З-за таго, што пэўны час адсутнічалі стасункі паміж Польшчай і Літвой Ковенскі біскуп на дзевяць гмін назначыў свайго генеральнага вікарыя, браслаўскага дэкана, які быў пробашчам у в.Слабодка – кс. Манькоўскага. У першы час улады ставіліся да яго вельмі падазрона і нават усталявалі патаемнае назіранне, палічыўшы яго літоўскім шавіністам. Тым не менш, З. Янушкеіч паставіў пад сумнеў стаўленне свайго папярэдніка да кс. Манькоўскага і высветліў памылковасць яго меркавання ў гэтым пытанні [1, с. 172].

Падыход старасты характарызуе яго не фармальным стаўленнем да дзяржаўна-канфесійных адносін. Больш за тое, усталяванне добразычлівых стасункаў з браслаўскім дэканам узмацніла аўтарытэт апошняга ў вачах парафіян.

Адметна, што каталіцкі духоўны асяродак часта станавіўся эпіцэнтрам міжнацыянальных спрэчак. Пробашчам Дукштаўскай парафіі быў кс. Шымашыс, літовец па паходжанню, польскага грамадзянства не меў. Па выніках размовы з ім кс. Манькоўскі дадзенай уладай вызваліў яго ад душпастарства ў парафіі і арганізаваў пераезд у Літву [1, с. 172]. Пробашч з Рымшанаў аналагічна характарызаваўся варожым настроем і займаўся распаўсюдам антыпольскіх улётак, пасля чаго выехаў у ЗША. У хуткім часе для ўрэгулявання польска-літоўскіх стасункаў з ініцыятывы старасты пасродкам кс. Манькоўскага адбыліся замены на ксяндзоў палякаў таксама ў Браславе і ў Свянцянах.

Такім чынам, бачна, што заручыўшыся падтрымкай духоўнага лідара каталікоў у Браслаўскім павеце, стараста мусіў зрабіць пэўныя перастаноўкі сярод ксяндзоў, каб выключыць магчымыя канфлікты, у той рэчаіснасці – антыпольскія настроі сярод літоўцаў.

У мемуарах З. Янушкевіч не абмінуў увагай каларытную асобу кс. Ю. Бародзіча, згадкамі пра якога насычана ўся міжваенная перыёдыка. Ён займеў славу яшчэ ў царскія часы, распачаўшы будаўніцтва касцёла ў Мёрах з буйнога скандалу, за што быў высланы ў Рыбінск. Аднак, пасля таго як вярнуўся, стаў пробашчам у Лявонпальскай парафіі і працягваў "місію" па будаўніцтве касцёлаў, якія па згадкам старасты нагадвалі драўляныя няўстойлівыя канструкцыі, дзе Ю.Бародзіч час ад часу праводзіў набажэнства [1, с. 178]. Іншыя крыніцы сведчаць аб яго варожым стаўленні не толькі да праваслаўных, але і да каталікоў, якіх імкнуўся справакаваць падчас публічных выступаў. Напрыклад, пасля візіту ў Друю, распаўсюджваў чуткі аб спробе айцоў Марыян яго атруціць, дайшло нават да следства [2, с. 47]. Аднак, пасля быў вымушаны выбачацца за свае паводзіны на старонках прэсы [3].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Ключавым выпадкам стаў эпізод, калі ён спрабаваў перашкодзіць пахавальнай працэсіі пахаваць праваслаўнага нябожчыка на агульных могілках мястэчка. Неўзабаве, пасля візіту арцыбіскупа Р. Ялбжыкоўскага і З. Янушкевіча Ю. Бародзіч вымушаны быў пакінуць парафію.

Аб прадстаўніках праваслаўнага духавенства З. Янушкевіч падае сціслыя звесткі. Агулам у павеце налічвалася 11 праваслаўных парафій, якія з пункту гледжання старасты характарызаваліся лаяльнымі адносінамі да "польскасці". Затое падкрэслівае індывідуальна-уласцівыя якасці святара Браслаўскай царквы А. Васілеўскага, а менавіта дальнабачныя захады да ўсталявання спрыяльных адносін з боку ўлады. У якасці прыклада аўтар успамінаў прыводзіць эпізод, які адбыўся ў дзень нараджэння Ю. Пілсудскага. Падчас набажэнства святар агучыў урачыстую прамову ў гонар маршалака ведаючы аб прысутнасці старасты ў царкве. Учынак быў красамоўны, улічваючы той факт, што гадзінай раней у касцёле казанне было цалкам рэлігійнае [1, с. 182]. Прыязнымі адносінамі да палякаў адзначаліся святары з Друі і Перабродздзя.

Што датычыцца стараверскіх абшчын, то ў іх не існавала царкоўнай іерархіі, аднак, сярод настаўнікаў духоўным старэйшынам лічыўся Ф. Кузняцоў. Улады над іншымі настаўнікамі не меў, але да яго прыслухоўваліся. Духавенства старавераў у вачах З. Янушкевіча было скампраметаванае злачыннымі ўчынкамі: некаторыя з настаўнікаў займаліся незаконным вінакурэннем, садзейнічалі крадзяжу коней і нават хавалі іх у малельні [1, с. 183].

Тым не менш, аўтар ставіцца са спачуваннем да старавераў Браслаўшчыны. Апошнія займалі прыгнечаныя пазіцыі і тлумачылі сваю крыўду існаваннем ціску яшчэ з царскіх часоў. Адсутнасць уплыву на сваіх вернікаў і неарганізаванасць апошніх сталі вынікам унутрыабшчыннай пасіўнасці.

Духоўнымі лідарамі яўрэйскай абшчыны Браслава з'яўляліся рабіны Гірш Валін і Аба Загор'е. Як адзначае, З. Янушкевіч яны не мелі вялікага ўплыву на аднаверцаў і калі патрабавалася вырашыць якое-небудзь пытанне з абшчынай, то запрашалі шануемых прадстаўнікоў са свецкага асяроддзя [1, с.184]. Ва ўспамінах жыхароў павятовага цэнтра засталася карціна поўнага ўзаемаразумення паміж служыцелямі іўдзейскага і хрысціянскага культаў: "Часта даводзілася бачыць пробашча з праваслаўным святаром, якія былі занятыя цікавай размовай, а калі-нікалі да іх далучаўся рабін…" [4].

Такім чынам, мемуары Зеліслава Янушкевіча з'яўляюцца каштоўнай крыніцай як па гісторыі дзяржаўна-канфесійных адносін, так і праблемных аспектах у рэгіёне. Праз прызму ўспамінаў прасочваюцца пытанні палітычнага характару, датычныя польска-літоўскага супрацьстаяння ў каталіцкіх парафіях павета. Асоба Ю. Бародзіча паказаная як авантурная і харызматычная, аднак, вельмі шкодная ў распальванні канфлікту паміж католікамі і праваслаўнымі павета. Сацыяльная праблема бачыцца ў правінах настаўнікаў стараверскай супольнасці. Лаяльнасцю і памяркоўнасцю характарызуюцца прадстаўнікі праваслаўнага і іўдзейскага духавенства. Усё гэта дае магчымасць рэканструяваць эпізоды з канфесійнага жыцця, што ўвасобіліся ў апісанні асоб і падзей.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура


1. Januszkiewicz, Ż. Moje wspomnienia Brasław, 1923–1932 r.: Bielsk-Podlaski 1933–39 r. / Ż. Januszkiewicz. – Oizstyn, 1995. – 313 s.
2. Надсан, А. Pro patria aiiena: Кляштар беларускіх айцоў марыянаў у Друі (1924–1938) / А. Надсан. – Менск [Мінск], 2006. – 160 с.
3. Borodzicz, J. Adklikau i pieraprasiu / J. Borodzicz // Хрысціянская Думка. – 1932. – №9, верасень. – С. 6.
4. Tam był nasz dom// Wspomnienia Kresowian (66) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.gonlec.net/gonlec/inne-dzialy/lektura-gonca/wspomnienia-kresowian-66.html. – Дата доступа: 26.02.2016.